Источник: **«Звязда» - 2013-02-08**

## Кнігі, якія немагчыма забыць

**Фотакарэспандэнт "Звязды" перамог у адной з намінацый Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі"**

**Другі раз у рамках Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмаша прайшло ўзнагароджанне пераможцаў Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі". Цырымонія ўзнагароджання адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

У сёлетнім конкурсе ўдзел бралі 175 выданняў ад 31 выдавецтва. А журы выбірала пераможцаў ажно ў 14 намінацыях. Прычым гэтым разам з'явілася адна новая — спецыяльная намінацыя ганаровага госця XX Мінскай МКВК, Расіі, — "Рускі свет".

Фотаальбом "Полацк: 1150" выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі" атрымаў Гран-пры ў намінацыі "Трыумф". Ганаровы знак-сімвал "Залаты фаліянт" і ганаровы дыплом імя Францыска Скарыны дастаўся гэтаму ж выдавецтву, дызайнеру Усеваладу Свентахоўскаму і паліграфічнаму прадпрыемству "Беларускі Дом друку".

Дыплом пераможцы і ганаровы знак-сімвал "Залаты фаліянт" ў намінацыі "ЛІТ-фармат", які ўручаецца выданням літаратурна-мастацкага кірунку", атрымала Святлана Татарнікава за выданне кнігі Алеся Краўцэвіча "Гедымін (1361—1341). Каралеўства Літвы і Русі". Дыплом першай ступені дастаўся кнізе Анатоля Бензерука "Мячы Грунвальда, альбо дванаццаць абаронцаў караля" выдавецтва "Мастацкая літаратура". Дыпломам другой ступені адзначылі выдавецтва "Беларусь", якое выдала кнігу вершаў Генадзя Пашкова "Званы юнацтва".



**Пісьменнік, грамадскі дзеяч, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец уручае прыз выканаўчаму дырэктару Выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзіміру Грозаву за перамогу ў намінацыі "Духоўнасць"**

**факсімільнага духоўна-асветніцкага выдання "Житие блаженной Ефросинии, игумении монастыря Вседержателя святого Спаса во граде Полоцке".**

Своеасаблівая мода на факсімільныя выданні рэлігійнага характару таксама знайшла падтрымку на конкурсе. Перамогу ў намінацыі "Духоўнасць" атрымала акурат факсімільнае духоўна-асветніцкае выданне "Житие блаженной Евфросинии, игумении монастыря Вседержателя Святого Спаса во граде Полоцке" Выдавецтва Беларускага Экзархата. Дыплом першай ступені цяпер належыць Анатолю Сцяцкевічу-Чабаганаву за гістарычна-дакументальныя кнігі "Я — сын Ваш" з серыі "Летапіс беларускай шляхты". Дыплом другой ступені ўручаны выдавецтву "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" за зборнік "Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст.".

У намінацыя "Залатыя скрыжалі", у якой разглядаюцца даведачныя і энцыклапедычныя выданні, найлепшым падарункавым выданнем стала кніга выдавецтва "Мастацкая літаратура" "Гісторыя Беларускай чыгункі. З стагоддзя XIX — у стагоддзе XX". Выдавецтву "Тэхналогія" прысуджаны дыплом першай ступені за двухтомнік Уладзіміра Ліхадзедава, Уладзіміра Пяфціева і Кірыла Сакалова "1812: храналогія Айчыннай вайны на старых паштоўках і ў графіцы". За раскрыццё тэмы нашай геральдыкі ў кнізе "Сучасная геральдыка Беларусі" "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі" атрымала дыплом другой ступені.



Конкурс, як правіла, багаты і на спецыяльныя прэміі і прызы. Спецыяльным дыпломам журы ў намінацыі "Залатыя скрыжалі" ўзнагароджаны электронная ўзнаўляльная версія каталога "Рэспубліка Беларусь. Экспартны патэнцыял" выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі"; электронныя выданні "Хрыстос — цэнтр нашай любові" і "Атрада і суцяшэнне" Спаса-Еўфрасінеўскага манастыра Полацкай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы.

Вялікі інтарэс выклікаюць заўжды і пераможцы ў намінацыі "АРТ-кніга", у якой ўдзел бяруць выданні літаратурна-мастацкага кірунку. Такія кнігі потым звычайна ставяць на

самае бачнае месца ў дзяржаўных кнігарнях і вельмі ахвотна рэкламуюць прадаўцы. Сёлета рэкламаваць будуць: альбом "Валянцін Губараў. Важна ўсё" з серыі "Беларусь мастацкая" выдавецтва "Мастацкая літаратура"; кнігі "Іван Міско: скульптура", "Оскар Марыкс. 1890—1976" і "Мастакі Парыжскай школы з Беларусі" — усё выдавецтва "Четыре четверти" (дыплом другой ступені); "Кнігі кірылаўскага шрыфту XVI — пачатку XX стагоддзя" выдавецтва "Белпринт" (дыплом другой ступені).

Найлепшай кнігай у намінацыі "Разам з кнігай мы расцём" (кнігі для дзяцей і юнацтва) прызналі кнігу "Дзе Купала начавала. Народныя песні. Калыханкі. Прыказкі і прымаўкі" ("Мастацкая літаратура"). Кніга цудоўнай беларускай казачніцы Алены Масла "Каляды з хроснай", выдадзеная ўсё ў той жа "Мастацкай літаратуры", атрымала дыплом другой ступені. Таксама дыпломы другой ступені ўручылі выдавецтву "Книжный дом" за кнігі "Цуда-казкі", "Казкі дзецям пра зверанят", "Казкі для самых маленькіх" у серыі "Любімая кніга малога", а таксама выдавецтву "АСАР" за кнігу Георгія Марчука "Добрае сэрца. 50 казак".

Кніга была і застаецца галоўнай крыніцай праўдзівай і праверанай інфармацыі, кніга вучыць і дае адказы амаль на ўсе пытанні. А таму да вызначэння галоўнага пераможцы ў намінацыі "Падручнік новага стагоддзя", у якой якраз і ўдзельнічаюць выданні вучэбнага кірунку, засталася без галоўнага прыза, затое дыплом першай ступені прысуджаны Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту за выданне падручнага дапаможніка з электронным дадаткам "Англійская мова. Сацыяльныя камунікацыі". Дыплом другой ступені дастаўся вучэбнаму выданню для 1-га класа "Буквар" выдавецтва "Народная асвета".

У намінацыі "Эўрыка" (навуковыя, навукова-папулярныя выданні) ганаровы знак-сімвал "Залаты фаліянт" і дыплом уручаны выдавецкаму дому "Беларуская навука" за выпуск навукова-папулярнага выдання "Хто жыве ў Беларусі". Дыплом другой ступені атрымала "Мастацкая літаратура" за падрыхтоўку і выданне кнігі "Напалеон. Ад Корсікі да Святой Алены ў паштоўках". Дыплом другой ступені прысуджаны выданню "Кнігі і кнігазборы Куцеінскага Богаяўленскага манастыра ў сярэдзіне XVII стагоддзя" выдавецтва "Технология".

Графічнае афармленне кнігі — вось тое, што робіць кнігу творам не толькі літаратурнага мастацтва, але і выяўленчага. А таму на беларускім конкурсе "Мастацтва кнігі" ёсць адмысловая намінацыя для фотаальбомаў і фотакніг — "Фотапогляд". Пераможцам у намінацыі стаў фотаальбом "Беларусь сінявокая. Кніга першая. Вада". Дыплом першай ступені атрымала выдавецтва "Беларусь" за выданне фотаальбома Анатоля Клешчука "Беларусь. Зямля песняроў", прысвечанага 130-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа. З чым шчыра і віншуем нашага шаноўнага калегу-звяздоўца! Выдавецтва "Рыф-тур" за фотаальбом Сяргея Плыткевіча "Планета Беларусь" таксама атрымала дыплом другой ступені.

У спецыяльнай намінацыі "За ўнёсак у захаванне духоўнай спадчыны" ўзнагароджана выданне "Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911-1912" з серыі "Энцыклапедыя рарытэтаў" выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі". Нацыянальная бібліятэка Беларусі атрымала дыплом першай ступені за факсімільнае ўзнаўленне выданняў "Калядная пісанка. 1913 год", "Буквар мовы славянскай. 1767 год" і "Буквар у жыцці нашых продкаў".

Найлепшай ў намінацыі "Садружнасць", якая ўручаецца за сумесныя праекты, прызнана фотакніга "Жывая вера. Ветка" з серыі "Энцыклапедыя рарытэтаў" ("Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі").

Перамога ў намінацыі "За прапаганду чытання" дасталася грамадскаму аб'яднанню "Беларусі саюз жанчын" за правядзенне ў 2012 годзе, які, як вядома, быў Годам кнігі, дабрачыннай акцыі "Маміна казка". А дыплом другой ступені атрымаў Белаграпрамбанк за фінансавую падтрымку праектаў выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі".

Беларуская школа кніжнай графікі сёння, вядома, ужо не тая, што была раней. Але ўсё адно заслугоўвае ўвагі. Прынамсі, на нацыянальным конкурсе. Так, у намінацыі "Майстэрства" найлепшы дызайнерам кнігі мінулага года прызналі Усевалада Свентахоўскага, найлепшым ілюстратарам — Уладзіміра Даўгялу, найлепшым фотамастаком — Дзяніса Раманюка.

У спецыяльнай намінацыі "Рускі свет" перамог дэпартамент сродкаў масавай інфармацыі і рэкламы кіраўніцтва Масквы за выданне кнігі Якуба Коласа "Новая зямля" ў перакладзе на рускую мову і стварэнне сумесных праектаў "Энцыклапедыя Перамогі. Беларусь — Масква", "Жывая вера. Ветка".

Пераможцы галоўнага конкурсу мастацтва кнігі ў краіне вызначаныя. А нам засталося пажадаць, каб кнігі атрымалі прызнанне не толькі журы, але і жывых патрабавальных і капрызных чытачоў. Гэта і будзе сапраўдным поспехам, сапраўдным прызнаннем.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**